# БУЦЬКО ІВАН ВІКТАРАВІЧ

Нарадзіўся Буцько Іван Віктаравіч 8 лістапада 1925 года ў вёсцы Малыя Бярозаўцы. Размяшчаецца гэта вёска ў Заходняй Беларусі, а ў тыя гады гэта частка нашай краіны знаходзілася ў складзе Польскай дзяржавы. Дзяцінства ў Івана было нялёгкім. Бацькі сваёй зямлі не мелі, прыходзілася працаваць на пана. У сям'і было пяцера дзяцей. Іван быў другім сынам, таму яму, як старэйшаму, з малых гадоў даводзілася дапамагаць бацькам па гаспадарцы. Калі хлопчыку было сем гадоў, сям'ю напаткала гора – памерла маці. Пасля гэтага жыць стала яшчэ цяжэй. Зразумела, што сур'ёзную адукацыю Івану атрымаць не было магчымасці. Пайшоў вучыцца ў польскую пачатковую школу, але і яе наведваць не было як. Можна было вучыцца толькі з надыходам зімы, у астатні час працаваў пастушком. Пра сярэднюю адукацыю не было чаго марыць. У 1939 годзе, калі пачалася Другая сусветная вайна, Івану было чатырнаццаць гадоў…


ВОЕННЫЙ БИЛЕТ
НБ № 1026629
Фамилия Бутько
Имя Иван
Отчество Викторович
Число, месяц и год рождения 8 ноября 1925
Личная подпись владельца
Выдан Щучинским районным военным комиссариатом Гродненской области (республики)
26 марта 1964 г.
ВОЕННЫЙ КОМИССАР
Подполковник
М. П.
Братиков
(звание, подпись)

I. Общие сведения
1. Место рождения д. Б. Березовцы Остринского п/совета Щучинского р-на Гродненской обл.
2. Национальность белорус
3. Партийность (с какого года) беспартийный
4. Состоит ли в ВЛКСМ (с какого года) не состоит
5. Образование 4 класса
6. Основная гражданская специальность не имеет
7. Семейное положение женат

*Фот. 1.* Ваенны білет Буцько І. В.

Буцько Іван Віктаравіч быў прызваны ў Чырвоную Армію 24 ліпеня 1944 года, калі была амаль вызвалена тэрыторыя Беларусі і стратэгічная ініцыятыва перайшла да савецкіх войск. Сваю службу Іван пачаў ў 45-м запасным артылерыйскім палку 1 Беларускага фронта, дзе навабранцаў рыхтавалі да баявых дзеянняў. Ветэран успамінаў, што ў "вучэбцы" вельмі

дрэнна кармілі. Салдаты самі збіралі лебяду і варылі “суп”. Пасля ж адпраўкі на фронт харчаванне было сытным.



*Фот. 2.* Буцько І. В. з франтавымі таварышамі. 1945 г.

У верасні 1944 года Івана Віктаравіча накіравалі служыць у 275-ы знішчальна-супрацьтанкавы артылерыйскі полк (4-я знішчальная брыгада 1-ы Беларускі фронт), які быў размешчаны на тэрыторыі Польшчы. У жніўні – снежні войскі 1 Беларускага фронта вялі баявыя дзеянні па ўтрыманні і пашырэнні плацдармаў на Віслe і Нараве, рыхтаваліся да зімовага наступлення.  Такім чынам, Буцько Іван Віктаравіч удзельнічаў у фарсіраванні Віслы, за праяўлены гераізм у гэтай аперацыі быў узгагароджаны медалём “За Адвагу”. З 14 студзеня па 3 лютага 1945 г., удзельнічаючы ў Вісла-Одэрскай стратэгічнай аперацыі, войскі 1 Беларускага фронта правялі Варшаўска-Познаньскую аперацыю і, вызваліўшы цэнтральную частку Польшчы з Варшавай, захапілі плацдарм на левым беразе ракі Одэр, які ў будучым будзе выкарыстаны пры наступленні на Берлін. Аперацыя насіла імклівы характар – на працягу 20 сутак савецкія войскі прасоўваліся на адлегласць ад 20 да 30 км за дзень.




*Фот. 3.* Ордэн Чырвонай Зоркі і медаль “За Адвагу”

За гэты час яны пераадолелі 7 умацаваных рубяжоў і 2 буйныя водныя перашкоды. У першы дзень наступлення войск 1 Беларускага фронта




*Фот. 4.* Пасведчанне і медаль “За вызваленне Варшавы”

14 студзеня 1945 года Буцько І. В. атрымаў скразное асколачнае раненне мяккай тканкі левага бядра і быў адпраўлены на лячэнне ў армейскі палявы шпіталь № 5284. Пасля лячэння 13 лютага 1945 года Іван Віктаравіч накіраваны ручным кулямётчыкам ў 216-ы стралковы полк 79 стралковай дывізіі 1 Беларускага фронта, сіля якога рухаліся на Берлін. Але 10 сакавіка, ужо на тэрыторыі Германіі, зноў апынуўся ў ваенным

шпіталі № 39442 са скразным асколачным раненнем мяккіх тканак левай галёнкі і апёкам II ступені левага прадплечча. Пралячыўся Іван Віктаравіч пятнаццаць дзён і працягнуў службу тэлефаністам ў 80-м гаўбіцкім артылерыйскім палку58 стралковай дывізіі 5 гвардзейскай арміі 1 Украінскага фронта, войскі якога прымалі ўдзел у Берлінскай аперацыі. У складзе гэтага палка дайшоў да Эльбы, дзе ў красавіку 1945 года адбылася сустрэча савецкіх і амерыканскіх войск. Ветэран вельмі ганарыўся, што прымаў удзел у гэтай гістарычнай падзеі.


Н. К. О.
Войсковая часть
полевая почта
— 39442 —
25 Марта 1945 г.
25/5

Справка

Дана красноармейцу 216 с.п тов. Буцько Ивану Викторовичу в том, что он в боях за Советскую Родину 10.03.45 г. был ранен. С 11.03.45 г. находился на лечении в в/ч п.п. 39442 по поводу сквозного осколочного ранения мягких тканей сред. трети левой голени и ожога II степени средней трети левого предплечья.

Ранение относится к категории легких.

Выписывается 25.03.45 г. в батальон выздоравливающих.

Начальник [illegible]
Капитан м/с
/Шуляев/

*Фот. 5*. Даведка Буцько І. В. аб раненні.

У маі 1945 года быў накіраваны камандзірам аддзялення праводнай сувязі 436-га гаўбіцкага артылерыйскага палка 112 стралковай дывізіі 6 арміі 1 Украінскага фронта, у складзе якога і сустрэў Вялікую Перамогу. 6 армія вяла баі па ліквідацыі акружанай групіроўкі войск праціўніка ў горадзе Брэслау.

Буцько Іван Віктаравіч ніколі не расказваў пра тыя жахі, якія заўсёды маюць месца на вайне. Сваім родным, дочцы, двум унучкам ён расказваў толькі аб чым-небудзь забаўным, што здаралася з ім ці з яго баявымі таварышамі, аб адносінах паміж савецкімі салдатамі і нямецкім мірным насельніцтвам. Амаль усе яго ўспаміны адносіліся да таго часу, калі Чырвоная Армія ўжо была на тэрыторыі Германіі. Там было шмат пакінутых нямецкімі жыхарамі дамоў і савецкія салдаты даследавалі, якія прадукты харчавання засталіся ў іх кладавых. У адным з дамоў Іван

Віктаравіч з таварышамі знайшоў кораб слівачнага масла і нешта белае сыпучае ў  мяшку. Вырашылі, што гэта мука і паспрабавалі спячы бліны. Але бліны рассыпаліся – гэта быў мел. Аднойчы, праязджаючы міма разбомбленага нямецкага эшалона, яны ўбачылі, як цячэ рака шакалада, які гарыць сінім полымем.

Розныя людзі траплялісі на вайсковым шляху Івану Віктаравічу. Разам з ім служыў малады хлопец з Бранскай вобласці, у якога падчас акупацыі загінула ўся сям'я. Так ён кожны раз пры сустрэчы з  мірным нямецкім насельніцтвам парываўся страляць у жанчын і дзяцей. Увогуле ж такая расправа асуджалася ваенным камандаваннем.

Пасля вайны Буцько Іван Віктаравіч да чэрвеня 1950 года служыў у ваеннай частцы 20105  камандзірам аддзялення сувязі, якая размяшчалася ў Магдэбургу ў Германіі. Жылі салдаты-франтавікі як у сям'і. Сітуацыя стала мяняцца, калі сталі прыходзіць навабранцы, нават узнікалі непаразуменні. З таго часу самым яскравым успамінам было выкрыццё праз пару месяцаў пасля Перамогі банды фашыстаў, якія ўкрываліся ў падземным аэрадроме ў Альпах.



*Фот. 6.* Буцько І. В. 1947 г.

Вярнуўшыся на Радзіму, Іван Віктаравіч працаваў восем гадоў на шахтах па здабычы вугля ў  Тульскай вобласці, а пасля да самай пенсіі калгаснікам у роднай вёсцы. За самаадданую  працу на карысць

Бацькаўшчыны ў 1986 годзе быў удастоены звання “Ветэран працы”. Пасля таго, як здароўе стала непакоіць усё часцей, пераехаў жыць да сваёй дачкі, Малахвей Веры Іванаўны (працавала настаўнікам у Падольскім дзіцячым садзе – сярэдняй школе), у нашу вёску. Памёр Буцько Іван Віктаравіч 13 лістапада 2002 года. Пахаваны на могілках вёскі Падольцы.

Немагчыма пераацаніць перамогу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, на франтах якой змагаліся з ворагам больш за 1,3 млн беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Свой уклад у Перамогу ўнёс і Буцько Іван Віктаравіч, які служыў на фронце з лета 1944 года (як толькі праводзілася мабілізацыя ў Чырвоную Армію пасля вызвалення Беларусі) да Перамогі. Быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі “За Адвагу”, “За вызваленне Варшавы”, За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.”, медалём Жукава, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, знакамі “Ветэран вайны 1941 – 1945 гг.”, “За доблесць і адвагу ў Вялікай Айчыннай вайне”, васьмю юбілейнымі ўзнагародамі, медалём “Ветэран працы”.

Цікавасць да мінулага заўсёды была звязана з неабходнасцю людзей лепш разабрацца ў сучасным, зразумець прычыны падзей, прадбачыць, у якім накірунку яны будуць развівацца. Мінулае не знікае бясследна. У кожным з нас яно пакідае след. У мінулага няма межаў, яго нельга змяніць. Яго забыццё – няшчасце, трагедыя для наступных пакаленняў.